**УДК 82.09**

# ЧАЛАВЕК ЯК ВЫРАЗНІК АСНОЎНЫХ ІДЭЙ І ПРЫНЦЫПАЎ «ВАЕННАЙ» АПОВЕСЦІ І. ПТАШНІКАВА

***Т.Р. БАГАРАДАВА***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Аналізуецца творчасць І. Пташнікава, прысвечаная ваеннай тэматыцы. За аснову бяруцца тры аўтарскія аповесці: «Лонва» (1964), «Тартак» (1967), «Найдорф» (1976). На прыкладзе жанру аповесці разглядаюцца асноўныя прынцыпы адлюстравання ваеннай праблематыкі ў творчасці аўтара. Адным з вядучых пытанняў беларускай ваеннай літаратуры з'яўляецца даследаванне феномена чалавека, што абумоўлена павышанай цікавасцю да праблем чалавечага быцця. У аўтара сустракаюцца розныя сродкі і спосабы перадачы ваеннага і мірнага быцця. Паслядоўна прасочваюцца перажыванні герояў у той ці іншай жыццёвай сітуацыі, якая падаецца ў рэтраспекцыі. У творах І. Пташнікава жыццёвая аснова носіць асабісты характар. З'яўляючыся пісьменнікам-аналітыкам, І. Пташнікаў своеасабліва паказвае час. Гэта можна заўважыць перш за ўсё ў паказе аўтарам пэўнага моманту дзеяння ў творах. Асаблівасцю беларускай прозы пра вайну з'яўляецца перапляценне праблем быцця з момантамі нацыянальнай гісторыі і сучаснасцю.*

**Уводзіны.** Кардынальныя змены, якія адбыліся на мяжы XX – XXI стагоддзяў ва ўсіх сферах грамадска-палітычнага, эканамічнага і сацыякультурнага жыцця беларускага грамадства, адлюстроўваюць новы этап гістарычнага быцця. У сувязі са зменай ідэалагічнай парадыгмы, што суправаджаецца пераасэнсаваннем каштоўнасцей і ідэалаў, пошукамі новых жыццёвых арыенціраў, несумненную навуковую цікавасць уяўляе аналіз інтэрпрэтацыі ў літаратуры тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Дадзеная тэма сугучная складаным напружаным сацыяльна-філасофскім, маральным і эстэтычным пошукам сучаснай эпохі.

Працэсы перабудовы сучаснага грамадства, фармаванне новай ідэалогіі, новых арыенціраў, звязаных з нацыянальнымі маральнымі традыцыямі, уяўляюць сабой складаныя трансфармацыі, якія дыктуюць неабходнасць іх мастацкага і навуковага пераасэнсавання, што дазволіць паглыбіць уяўленні пра развіццё сучасных мастацка-эстэтычных прынцыпаў адлюстравання рэчаіснасці ў айчыннай літаратуры. Без усебаковага аналізу гэтых праблем нельга вызначыць далейшыя перспектывы развіцця ўсіх відаў мастацкай творчасці, у тым ліку і літаратурнай. Аналіз немагчымы і без увагі да мінулага, да праблемы «чалавек і вайна».

Краевугольным каменем беларускай ваеннай эстэтыкі з'яўляецца даследаванне феномена чалавека, што абумоўлена павышанай цікавасцю да праблем чалавечага быцця. Галоўная танальнасць беларускай «ваеннай» аповесці – роздум, імкненне асэнсаваць не толькі падзеі, але і псіхалогію чалавека ў крытычнай сітуацыі. Т. Шамякіна адзначае: «Чалавек – гэта Бог, калі толькі ён – Чалавек» [1, с. 262]. Адсюль імкненне аўтараў да больш поўнага і глыбокага раскрыцця ўнутраных матываў, ідэйных і маральных вытокаў паводзін чалавека на вайне.

У той жа час, імкнучыся разабрацца ў карэнных пытаннях філасофіі ваенных дзеянняў, пісьменнікі не толькі раскрываюць у мастацкіх дэталях усю праўду тых гадоў, але і ўзнаўляюць эпахальны сэнс гэтай гістарычнай падзеі, што садзейнічае ўспрыманню мастацкага матэрыялу новымі пакаленнямі чытачоў як сістэмы не толькі падзей, але і ўзаемаадносін. «Пасляваенная літаратура… пацвярджае старую ісціну – зварот да ваеннай тэматыкі і ваеннай праблематыкі звязаны з пастаноўкай рашаючых, галоўных праблем асабістага і нацыянальнага быцця» [2, с. 11].

Традыцыйнай асаблівасцю беларускай аповесці пра вайну з'яўляецца тое, што яна аддавала перавагу вобразным сродкам, якія раскрывалі быт ваеннай рэчаіснасці. В. Каваленка зазначае: «У ёй пераважае традыцыйны вопыт адлюстравання вясковага быту і ўнутранага свету селяніна, умоўнасць даволі своеасаблівa спалучаецца з рэалістычна-бытавым вобразам» [3, с. 25].

Сёння нельга казаць пра вайну, не разглядаючы яе ў гістарычным развіцці. Яна, зазначаў Д. Гранін, «…дазваляе пісьменніку як гісторыку даследаваць драмы народныя і душу асобнага чалавека… і зразумець ход вайны не адцягнена, а ў сувязі з усімі папярэднімі абставінамі народнага жыцця» [4, с. 85].

У літаратуры 1960 – 70-х гадоў варта адзначыць павышаную цікавасць да кожнага канкрэтнага героя, засяроджванне ўвагі на пэўнай сітуацыі, узмацненне гуманістычнага пафасу. Пішучы пра вайну, аўтары разважаюць пра чалавека ў экстрэмальных умовах: таго, хто перажыў вайну, «чыя душа ўражана ёю, асуджанага навекі вяртацца да яе ў думках і нанова перажываць мінулае» [5, с. 133]. Асаблівасцю беларускай прозы пра вайну з'яўляецца перапляценне праблем быцця з момантамі нацыянальнай гісторыі і

сучаснасцю. М. Тычына канстатуе: «Уласна чалавечае нязменна ставілася…ў прамую залежнасць ад агульнанароднага» [6, с. 128]. Чалавек, які бачыў вайну непасрэдна з акопа, і мацней за астатніх адчуваў на сабе цяжар абставін, акумуляваў у сабе маральны і сацыяльны вопыт свайго народа.

**Асноўная частка.** Творчасць Івана Пташнікава пачалася ў вельмі спрыяльных умовах сярэдзіны 1950-х гадоў. «Творчая індывідуальнасць, – па словах С. Андраюка, – у гэты час магла выявіцца адкрыта і поўна, талент раскрываўся свабодна, арганічна выяўляў сваю мастакоўскую адметнасць» [7, с. 159]. Творы аўтара, як і творы яго калег-пісьменнікаў І. Чыгрынава, В. Адамчыка, Б. Сачанкі, М. Стральцова і іншых, – гэта мастацкая гісторыя аднаго пакалення, якое перанесла вайну ў дзяцінстве. Праўда, кожны з гэтых пісьменнікаў па-рознаму апавядае пра сваё далёкае маленства. Кажучы пра «ваенную» аповесць І. Пташнікава, варта адзначыць, што ў яго творчасці заўважаецца спецыфічнае вобразнае абагульненне, «дзе праз самую трагедыю… раскрываецца і веліч перажытага чалавекам, і яго гераізм» [3, с. 30]. Пташнікаў імкнецца паказаць нацыянальны беларускі характар пад уплывам разнастайных, часам жорсткіх, абставін. Адсюль пільная ўвага да канфліктных сітуацый, да канкрэтнасці асяроддзя, сувязі яго з чалавекам.

Т. Шамякіна зазначае: «…Тут няма нічога істотна новага: традыцыя асвятлення шматлікіх сувязяў чалавека і асяроддзя ідзе ў рэалістычнай літаратуры яшчэ ад Бальзака і Гогаля… Абапіраючыся на ўжо дасягнутае, на творчыя здабыткі Я. Коласа, К. Чорнага, М. Гарэцкага, М. Лынькова, беларускія сучасныя пісьменнікі пачалі гаварыць пра маральныя, духоўныя каштоўнасці народа, кожнага асобнага чалавека, праз побыт людзей выяўляючы глыбіню сацыяльных пераўтварэнняў. Так, у Пташнікава: імкненне да паўнаты выяўлення чалавечай індывідуальнасці ідзе нароўні з шырокім ахопам асяроддзя, у якім жыве герой» [8, с. 35]. Пісьменнік бярэ жыццё як працэс, у якім амаль усе факты эстэтычна раўназначныя, дзе для жыццядзейнасці чалавека важныя як падзеі грамадскага кшталту, так і сфера побыту, асабістыя ўзаемадачыненні. Мастацкі свет, які стварае І. Пташнікаў у сваіх творах, адкрыты ў прасторы і часе; ён не мае строгай сюжэтна-кампазіцыйнай ці жанравай абмежаванасці, падпарадкаванасці нейкай зададзенай ідэі. Не жыццё само па сабе, а жыццё канкрэтнага чалавека; не жыццёвая сітуацыя ў бытавым плане, а сітуацыя, у якой вырашаецца лёс чалавека, трапляюць пад увагу аўтара. У яго творах жыццё не мае пэўных прасторавых і часавых межаў. У іх адчуваецца бясконцасць свету і чалавечага быцця. «Творы пісьменніка па сваёй мастацкай структуры і жыццёвай аснове – нібы «кавалкі» самога жыцця, адкрытыя ў рэчаіснасць» [7, с. 162].

Свет пісьменніка з’яўляецца непаўторным. Гэта – мікракосм, які заключае ў сабе ўсё неабходнае для існавання. У гэтым мастацкім свеце няма нічога выпадковага, бо кожная дэталь – гэта часцінка таго свету, які патрэбны для жыццядзейнасці чалавека. Па словах С. Андраюка, «…Усе падрабязнасці, апісанні, карціны, сітуацыі не толькі жывапісна-яркія, выразныя. Яны насычаны чалавечымі пачуццямі…» [7, с. 162]. Жыццё паказана не аб’ектыўна-нейтральна, а як жыццё пэўнага чалавека. Гэты прынцып адлюстравання навакольнага свету падаецца праз прызму ўспрымання героя. Чалавек пры такім узнаўленні рэчаіснасці – своеасаблівы цэнтр, які ўсяму надае парадак і пэўную форму.

Проза І. Пташнікава – з’ява па-мастацку арганічная і выразна акрэсленая. Аўтар піша пра тое, што эмацыянальна набыта ў гады дзяцінства і юнацтва; пазней яно пераасэнсавана і трансфармавана праз прызму ўласнага і сацыяльнага вопыту. Менавіта таму пісьменнік імкнецца падкрэсліць рэальную аснову сваіх твораў. «Падзеі, канфлікты, абставіны, агульная духоўная атмасфера, нарэшце, ідэйны змест – усё звязана з прыродай. А яе ўвасабляе лес» [7, с. 158]. Менавіта ён з’яўляецца арэнай дзеяння, каталізатарам усіх падзей: «Лес быў сіні ад густой смугі. За ім, якраз на Карчаваткі, падымаліся высока ўгару бурыя тулягі – былі што сціснутыя вялікія кулакі… Ад сонца тулягі гусцелі і рабіліся чырвоныя – здавалася, кулакі сцягаліся і набеглі кроўю» [9, с. 57].

Чалавек і навакольны свет уяўляюць сабой арганічны сінтэз не толькі ў знешніх сувязях, але і ў глыбокай унутранай з’яднанасці. Яны падпарадкоўваюцца адным і тым жа законам развіцця. Аўтар арганічна спалучае прыроду чалавека і прыроду навакольнага свету – менавіта ў гэтым бачыцца мастацкая гармонія ў творах. С. Андраюк падкрэслівае: «У пісьменніка, у яго творах, прысутнічае (як інстынкт жыцця) парыванне знайсці, паказаць, сцвердзіць глыбінную ўзаемазалежную сувязь паміж асобнымі фактамі, падзеямі, сітуацыямі на розных узроўнях рэчаіснасці» [10, с. 4]. Сучасны чалавек знаходзіцца ў шматграннай узаемасувязі і з навакольным светам, і з грамадствам. Абставіны (грамадскія законы і ўмовы) вызначаюць унутраны стан чалавека і яго паводзіны. Гэтыя абставіны на сучасным этапе развіцця грамадства часцей за ўсё шматпланавыя і нават драматычныя; яны патрабуюць ад чалавека выключнай мабілізацыі духоўных і фізічных магчымасцей.

На прыкладзе апісання мясцін Лагойшчыны І. Пташнікаў імкнецца паказаць навакольны свет. Аўтар разгорнута і ўсебакова ўзнаўляе падзеі тых гадоў, якія засталіся ў яго свядомасці – вайна, пасляваенныя гады, сучаснасць. Засяроджанасць на адным дае магчымасць выявіць усё новыя сацыяльныя, псіхалагічныя, філасофскія аспекты, нават пласты чалавечага быцця.

Для твораў І. Пташнікава характэрная адсутнасць прасторавых межаў пры апісанні падзей знешняга жыцця, пэўных мясцін ці краявідаў; персанажы таксама непадуладныя і часавым межам. Плынь чалавечай свядомасці арганічна спалучаецца з плынню жыцця, грунтуецца на канкрэтнай жыццёвай аснове; галоўныя іпульсы для плыні свядомасці ідуць ад рэальных умоў існавання, бо чалавек пастаянна ўзаемадзейнічае з асяроддзем: «Ну і чорт з ім, хто дзе цяпер стогне, зямля ўся стогне. Усіх не наслухаешся. У нас свае, вун… Вёска цэлая стогне…» [9, с. 94].

Вядомы чэшскі даследчык В. Жыдліцкі даваў ацэнку творам І. Пташнікава, адзначаючы прысутнасць у іх чалавека ў канкрэтным «адрэзку асабістага быцця». Даследчык таксама падкрэсліваў адметную ролю і ўплыў кожнай дэталі пры стварэнні карцін чалавечага быцця: «Ён убачыў цяпер, што немцы ўсе ў жоўтых дзягах: і падпяразаны шырокімі жоўтымі дзягамі, і плечы ў іх пераматаны, што ў коней, жоўтымі набераткамі, і вінтоўкі ў іх кароткія і жоўтыя… Самі сівыя ад пылу і ўсе дробныя і маладыя, маладзей за мужчын у вёсцы. Яны ўсё ішлі і ішлі без аддухі, пасля зноў ехалі на веласіпедах і курылі, кідаючы акуркі яму аж пад ногі» [9, с. 177 – 178].

Такім чынам, галоўным прынцыпам мастакоўскага адлюстравання навакольнай рэчаіснасці стаў паказ унутранага жыцця чалавека, магчыма таму колькасць персанажаў у творах мінімальная.

У пазнейшай творчасці І. Пташнікаў імкнецца паказаць жыццё ў яго сацыяльна-бытавых праявах. Аднак найбольшай гармоніі і выразнасці абмалёўкі аўтар дасягае тады, калі паказвае чалавека ў яго арганічным спалучэнні і з навакольным светам, і са светам прыроды: «Вечарэла. На захадзе, дзе хавалася сонца, пагусцела чырвонае неба, як набегла крывёю. Снег на полі зрабіўся сіні; калі ступаў конь, з-пад ног у яго разлятаўся ў бакі лёгкі іней, што пух» [9, с. 124]. Такім чынам, па словах С. Андраюка, «жыццё чалавека ўвасабляе ў сабе жыццё вёскі, а жыццё вёскі – жыццё народа» [10, с. 12].

Кажучы пра пераемнасць літаратурных традыцый, згодна з меркаваннямі даследчыкаў (Т. Шамякіна, С. Андраюк і інш.), варта адзначыць тое, што творчасць В. Быкава, І. Пташнікава, Б. Сачанкі, В. Адамчыка і іншых беларускіх пісьменнікаў базуецца на лепшых традыцыях прозы К. Чорнага ў іх сучаснай інтэрпрэтацыі. Цікавасць да яго творчасці ў аўтараў была выклікана неабходнасцю ўсвядоміць вайну з этычнага пункту гледжання, пад знакам сучасных канцэпцый маральнага вопыту мінулага. Наогул, псіхалагічны пачатак творчасці пісьменніка можна шукаць у рускіх класікаў: Л. Талстога, І. Буніна, А. Чэхава.

Кажучы пра паэтыку твораў І. Пташнікава, трэба адзначыць сувязь з мастацкай традыцыяй Я. Коласа, якая тлумачыцца падабенствам прыроднага і нацыянальнага пачаткаў.

Схільнасць да філасофскага адлюстравання рэчаіснасці выявілася ў І. Пташнікава не адразу. Пошук асноўных тэндэнцый пачаўся ў апавяданнях «Алёша» і «Алені», якія з’явіліся падыходам да аповесці «Лонва» з яе гуманістычнымі, сцвярджальнымі інтанацыямі. Многія назвы твораў пісьменніка – гэта тапонімы: «Чакай у далёкіх Грынях», «Лонва», «Тартак», «Мсціжы», «Найдорф».

У 1964 годзе Пташнікаў надрукаваў аповесць «Лонва». Адным з істотных момантаў твора з’яўляецца пэўная адпаведнасць аўтарскага ўзросту з узростам герояў твора. «Лонва» – твор пераходны ў жанравых адносінах. Гэтую аповесць умоўна можна падзяліць на своеасаблівыя навелы, якія ў часопіснай рэдакцыі называліся эскізамі. Кожны эскіз нагадвае кавалак жыцця героя; у пэўным сэнсе ён цэласны, хаця і з моцным адчуваннем вырванасці з жыцця. Падзея, якой прысвечаны эскіз, падаецца пераважна праз успрыманне аднаго з галоўных герояў. Сутнасць чалавека вызначаецца ў значнай ступені яго адносінамі да прыроды. Раздзелы ў «Лонве» ўспрымаюцца як эскізы. Існуюць яны не самі па сабе, не маюць выразнай унутранай завершанасці, як гэта ўласціва жанру навелы, а з’яўляюцца часткамі, «кавалкамі» цэлага. Галоўным для аўтара было паказаць не пэўную падзею, а жыццё вёскі Лонва ўцэлым. У творы паказана жыццё звычайных людзей на сваёй зямлі. Драматызм і трагізм нараджаюцца з разумення складанасці жыцця наогул, супярэчнасці кожнага чалавека. Трагізм вынікае з падзей мінулай вайны. Уплыў вайны ў аповесці адчуваецца ў дачыненні да паводзін, фармавання характараў людзей. Унутраны свет чалавека даследуецца І. Пташнікавым у руху супярэчлівасці пачуццяў, аналітызм перадачы якіх базуецца зноў жа на сінтэзе коласаўскіх і чорнаўскіх традыцый. У аўтара можна назіраць адзначаны вышэй сімбіёз чалавека і прыроды; апошняя стварае і перадае настрой. Канкрэтныя дэталі навакольнага асяроддзя спрыяюць узнікненню псіхалагічнага малюнка ў творы, раскрываюць характары герояў. Дэталізацыя ў Пташнікава – выяўленне яго пісьменніцкага светабачання. У «Лонве» пейзажныя вобразы ўдзельнічаюць у агульнай стылёвай сістэме твора. Па вызначэнні С. Андраюка: «Гаворачы пра ўзаемаадносіны чалавека і навакольнай прыроды ў творчасці Івана Пташнікава, не трэба разумець гэта як галоўны яе змястоўны момант, як яе асноўную ідэю. Гаворка ідзе пра першасную аснову сутнасці чалавека, пра вызначальны момант ягонага эмацыянальна-этычнага свету. Гэта тая стрыжнёвая лінія, якая яднае творы пісьменніка, дае магчымасць бачыць іх і ў ідэйным, і ў мастацкім развіцці» [11, с. 72].

У 1960-я гады павысілася цікавасць пісьменнікаў да тэмы «дзяцінства на вайне», якая пачала раскрывацца пад знакам агульнай для ўсёй сучаснай літаратуры праблемы даследавання маральных выто-

каў перамогі. Вайна вачыма падлетка, дзіцяці ўспрымаецца вастрэй і страшней. На падобную тэму з'явілася многа твораў. У беларускай літаратуры можна назваць такія, як: «Апошнія і першыя» Б. Сачанкі; «Алёшка», «Тартак», «Лонва», «Найдорф» І. Пташнікава; «Салодкія яблыкі» В. Адамчыка; «Суд у Слабадзе» В. Казько і інш.

У канцы 1967 года ў часопісе «Полымя» (№ 12) была надрукавана аповесць І. Пташнікава «Тартак». Даследчыкі В. Бечык, Ул. Гніламёдаў, П. Дзюбайла, В. Тарас і іншыя далі твору высокую ацэнку. Аповесць можна лічыць закончанай характарыстыкай станаўлення стылю пісьменніка – гэта адна з нешматлікіх у беларускай літаратуры, што паказвае вайну як бы знутры, у будзённым і страшным жыцці мірнага насельніцтва ў час акупацыі. Жыццё і смерць, чалавек на вайне, грамадская каштоўнасць чалавечага жыцця ствараюць аснову аповесці, у якой чалавек выступае як носьбіт вышэйшай формы гістарычнай актыўнасці, таму будзённасць і канкрэтнасць у абмалёўцы рэалій, што акаляюць чалавека, і саміх чалавечых думак і перажыванняў мае прынцыповае значэнне. Суб'ектыўна-канкрэтнае ўспрыняцце падзей героямі аповесці тоіць у сабе ідэю агульначалавечага ўспрыняцця жыцця наогул. Асабліва моцна праявілася ўздзеянне К. Чорнага: напружаны рытм і цяжкаватасць фразы. У «Тартаку» А. Кучар адзначаў уплыў У. Фолкнера: «Сапраўды, Фолкнер, як і некаторыя іншыя сучасныя пісьменнікі, з ярка выражаным імкненнем да стварэння сучаснай міфалогіі, любіў браць, як ён казаў, "групу людзей" і прымушаў іх перажываць нейкія, часцей, прыродныя, катастрофы» [8, с. 61 – 62].

У аснову аповесці былі пакладзены рэальныя падзеі – лёс спаленай разам з людзьмі вёскі Дальвы ў час блакады сорак чацвёртага года на возеры Палік. Шэсць чалавек едуць у Краснае – вязуць зерне па загадзе немцаў з вёскі Дальва да Тартака: Янук, Наста, Таня, Алёша, Махорка, Боганчык. Па чарзе апавядаецца і ўзгадваецца гісторыя кожнага з іх, іх вясковае жыццё ў дэталях. Прырода перадае напал пачуццяў і падзей, адлюстроўваючы яго па ходзе руху. Падаецца эпізод з мірнага жыцця кожнага чалавека і іх смерць ад абстрэлу ў час паездкі.

На сюжэтную лінію твора С. Андраюк адзначае ўплыў эстэтыкі В. Быкава. Героі «Тартака», розныя па характары, узросту, ставяцца ў аднолькавую сітуацыю, перад імі стаіць праблема выбару: прага жыцця і непазбежнасць смерці, дабро і зло, здрадніцтва і гераізм. Т. Шамякіна заўважае: «Канфлікт «Тартака», аповесці трагічнай, – гэта канфлікт жыцця і смерці. Канкрэтныя ўвасабленні гэтых паняццяў – тое, што сведчыць пра жыццё, і тое, што сведчыць пра смерць, у аповесці не проста яркія і маляўнічыя дэталі, а, як правіла, разгорнутыя вобразы-сімвалы з выразным эмацыянальна-іншасказальным сэнсам» [8, с. 65].

У сімвалічным плане падаецца смерць кожнага з герояў. І зноў на першае месца выступаюць прыродныя пейзажы і вобразы, якія таксама набываюць сімвалічнае значэнне: сасна, неба, месяц, зоркі, воблакі і інш.: «Месяц, круглы і жоўты, што ячны блін з вялікай скаварады, стаяў цяпер за плячыма над самай зямлёй. З воза здавалася, што ён бег ззаду ўздагон – ад адной сасны да другой. У небе над галавой пагусцелі зоркі, сталі чырвоныя;…на небе стаяла блеклая зеленаватая зара…» [9, с. 106]. Акрамя таго, прырода тут выступае як праекцыя чалавечай душы, на ёй адбіваецца складанасць і зменлівасць псіхалагічнага стану кожнага з герояў аповесці. У творы прысутнічае інтанацыя незакончанасці: пісьменнік ужывае шматлікія шматкроп'і, якія перадаюць інтанацыю трывогі і напружанасці: «Па трагічнаму напаўненню, па стылю «Тартак» – адзін з самых бязлітасна драматычных твораў у беларускай літаратуры» [8, с. 73].

Аповесць І. Пташнікава «Тартак» дае ў беларускай, і ўсёй савецкай прозе найбольш доказныя падставы для пераасэнсавання паняцця «ахвярнасці» ў вайне з фашызмам. Усе героі па сваім становішчы ў вострай сітуацыі, апісанай у аповесці, з'яўляюцца ахвярамі вайны: «– Не дзеці, дык мы астанёмся жыць. Не мы – дык дзеці… Не свае – чужыя. Нехта астанецца. Усе не згараць…Ты думаеш, і мне не баліць?..» [9, с. 112]. Трагізм вайны ў аповесці І. Пташнікава паказаны не праз колькасць знішчаных людзей і вёсак, а праз жудасныя карціны душэўных пакут людзей, якія адчуваюць безвыходнасць свайго становішча.

У 1976 годзе выходзіць асобным выданнем аповесць «Найдорф». Яна друкавалася ў часопісе «Полымя» ў 1975 годзе (№ 2 – 3). Гэты твор атрымаў адзінадушна станоўчую ацэнку і крытыкі, і грамадскасці наогул. Аповесць адзначана штогадовай прэміяй часопіса «Полымя» (1975) і дзяржаўнай прэміяй БССР імя Я. Коласа (1978). Л. Ламека адзначае: «Псіхалагічна насычанай і змястоўнай была аповесць «Найдорф»,…у якой І. Пташнікаў працягнуў даследаваць вытокі гераізму…» [12, с. 196].

Варта адзначыць, што сюжэты аповесцей І. Пташнікава ў асноўным хранікальнага характару: у аповесці «Лонва» – хроніка жыцця вёскі Лонва першага пасляваеннага года; у аповесці «Найдорф» – хроніка першых пасля вызвалення з-пад нямецкай акупацыі дзён жыцця вёскі Венеры.

У аповесці «Найдорф» спалучаюцца як бы дзве жыццёвыя стыхіі: вайна і мір, жыццё і смерць, стварэнне і разбурэнне. Вайна жыве ў чалавечай свядомасці. Чалавека шмат у чым фарміруюць абставіны – сацыяльныя, бытавыя, прыродныя. Пташнікаў у аповесці выключную ўвагу аддае мастацкаму ўзнаўленню жыццёвых абставін. Свет рэальнага жыцця, з аднаго боку, натуральны, а з другога – арганічна звя-

заны з унутраным светам чалавека, мастацкага вобраза. Свет абставін у плане эстэтычным усё больш падпарадкоўваецца свету чалавека. Пісьменнік дзеля вызначэння ідэі твора, стварэння агульнага эмацыянальнага ладу і ў дадзенай аповесці падключае прыроду. Час, апісаны ў аповесці, – май – чэрвень 1944 года. Час самай жорсткай апошняй фашысцкай блакады ў апісаным раёне, так званай аперацыі «Кармаран», якая праводзілася сіламі рэзерваў групы армій «Цэнтр». Мэта аперацыі «Кармаран» – загнаць партызанскія брыгады Барысаўска-Бягомльскай зоны ў раён балот возера Палік, акружыць і знішчыць. Фашысты загналі ў «кацёл» да дваццаці партызанскіх брыгад: з партызанамі ішлі і людзі з вёсак. Падзеі вялікія, значнага маштабу пісьменнік паказвае праз сітуацыю, абмежаваную ў прасторы і часе. А ў ёй – праз чалавека: «Грому не было чуваць; пахла дажджом і гарам. Цяжка ісці, спірае ў грудзях; за спінай, дзе вісіць ручны кулямёт Ушакова, робіцца мокра, а Жаваранка ступае і ступае па сіўцы і па верасе. Усюды ціха і трывожна» [13, с. 54].

Суадносячы «Найдорф» з іншымі творамі канца 1970-х гадоў, асабліва пра вайну, можна выразна заўважыць, як твор насычаецца сучаснымі духоўнымі тэндэнцыямі. Гэта бачыцца ў тым, што гераічная нота ў агульнай танальнасці твора становіцца вызначальнай, падпарадкоўваючы сабе матыў трагічны. Змест «Найдорфа» – гэта роздум над прызначэннем чалавека ў свеце, сутнасць якога супраціўная разбурэнню і знішчэнню; гэта ўслаўленне стваральнага пачатку ў жыцці і пратэст супраць вайны і смерці. У аповесці І. Пташнікава існуюць дзве жыццёвыя сферы, дзве жыццёвыя стыхіі – вайна і мір, жыццё і смерць, стварэнне і разбурэнне: «Над выганчыкам узляцеў бацян – ад стрэлу; уцякаў на Пагурак – на балота» [13, с. 233].

Пэўная сімвалічнасць назіраецца ў апісанні мірнага жыцця, яго эмацыянальна-рамантычнай насычанасці, сканцэнтраванасці жыццёвага матэрыялу: «Падняўшыся ад жытняга клінка да ям, Жаваранка адразу ўбачыў Венеру, што ўсё роўна першы раз: шэрую здалёку, вялікую і пустую, як парожняе ластаўчына гняздо» [13, с. 144]. У раздзеле другой часткі, якая называецца «Дома» і прысвечана першым гадзінам пераходу да мірнага жыцця, ёсць некалькі запаволеных у сваім падзейным руху апісанняў. У гэтых эпізодах, у эмацыянальным напаўненні ўсё ж моцна адчуваецца прысутнасць вайны, якая жыве ў псіхіцы чалавека. У паказе псіхалагічнага стану чалавека на парозе жыцця і смерці відавочны катарсічны пачатак (Жаваранак бачыць сваіх дзяцей). Для ўзмацнення псіхалагічнага пачатку ў творы аўтар выкарыстоўвае антытэзу (гарманіст і труна дзіцяці).

Хронікай у звыклым сэнсе слова аповесць назваць нельга. Кампазіцыя аповесці нетрадыцыйная; яна будуецца па прынцыпу: пралог-кульмінацыя – эпілог-кульмінацыя. Народны характар партызанскай вайны ў «Найдорфе» раскрыты надзвычай моцна. Ёсць у аповесці і яшчэ адзін маральна-этычны і псіхалагічны пласт рэчаіснасці – паказ усенароднага супраціўлення.

У мастацкай структуры твораў І. Пташнікава суіснуюць самыя розныя сінтаксічныя канструкцыі: шмат перарывістых, абарваных сказаў, будова фразы, своеасаблівыя пазіцыі рытму. Агульны рытм сюжэта (паводле Т. Шамякінай) у аўтара цяжкаваты. Пісьменніку было складана з аб'ёмнага, вельмі канкрэтнага матэрыялу зрабіць дынамічны і напружаны сюжэт. Канкрэтыка стварае пэўныя цяжкасці ва ўспрыняцці пісьменніцкіх твораў.

Сродкі і спосабы перадачы ваеннага быцця ў аўтара розныя. Па вызначэнні П. Васючэнкі, яны могуць быць: зрокавыя (графіка – шэрыя, жоўтыя, белыя, цёмныя таны); слыхавыя (стрэлы, выбухі); пахавыя (пораху, пылу, дыму – у кантрасце з пахамі зямлі, травы, сена, зерня); дотыкавыя (боль, гарачыня, холад); смакавыя (горыч, соль, кроў на вуснах). Даследчык адзначае: «Праявы вайны часта атаясамліваюцца з дэталямі сялянскага побыту, эпізодамі вясковай працы» [14, с. 46].

**Заключэнне.** У творах Івана Пташнікава адчуваецца жыццёвая аснова, якая носіць надзвычай асабісты характар. У творах аўтар піша пра сваю «малую радзіму»; пра тое, што знаходзіцца ў межах яго асабістага жыццёвага вопыту. Ва ўзнаўленні жыцця пісьменнік імкнецца да максімальнай паўнаты і ўсебаковасці (бытавой, пейзажнай, псіхалагічнай). Асноўны прынцып адлюстравання аўтара – жывапісна-аналітычны: мастацкі свет не мае строгай сюжэтна-кампазіцыйнай ці жанравай абмежаванасці.

Як у пісьменніка-аналітыка ў Пташнікава своеасаблівы паказ часу. Гэта можна заўважыць перш за ўсё ў прывязанасці аўтара да дадзенага моманту, які ён расчапляе на асобныя перыяды. Можна паслядоўна прасачыць перажыванні герояў у той ці іншай жыццёвай сітуацыі, вырашэнне якой рэтраспектыўна суадносіцца з раней перажытым. Адметнасць яго герояў заключаецца ў «іх моцнай духоўна-этычнай напоўненасці. Для іх асноўнае – зразумець маральныя ідэалы часу, прасачыць іх вытокі, каб убачыць перспектыву» [10, с. 161]. Сучаснасць вельмі часта праектуецца на былыя часы з мэтай даць ёй сапраўдную ацэнку. С. Андраюк канстатуе: «Той, хто перажыў вайну, яе выпрабаванні, жахі, усё ў наступным жыцці можа ўспрымаць, толькі суадносячы з гэтым суровым вопытам. У ім – крытэрыі маральна-этычныя; у ім – крытэрыі праўдзівасці. Сёння ўжо больш відавочна становіцца, што ў творчасці тых, хто перажыў вайну, асабісты вопыт, асабістае перажытае, асабістая памяць усё больш узба-

гачаецца, паглыбляецца «памяццю народнай», а магчыма, дзякуючы прайшоўшым гадам, гістарычнай праверцы і выверцы сама памяць асобнага чалавека становіцца своеасаблівым індывідуальным увасабленнем «памяці народнай» [10, с. 141].

ЛІТАРАТУРА

1. Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі (нарысы) / Т.І. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 400 с.
2. Вторая мировая война в литературе зарубежных стран / П.М. Топер [и др.]; под общ. ред. П.М. Топера. – М.: Наука, 1985. – 616 с.
3. Коваленко, В.А. Общность судеб и сердец / В.А. Коваленко. – Минск: Наука и техника, 1985. – 351 с.
4. Литература о войне и проблемы века: сб. науч. ст. / НАН Беларусі: А.М. Адамович (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 1986. – 271 с.
5. Тычына, М. Час прозы: літаратурна-крытычныя артыкулы / М. Тычына. – Мінск: Маст. літ., 1988. – 206 с.
6. Тычына, М. Народ і вайна / М. Тычына. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 327 с.
7. Андраюк, С.А. Пісьменнікі. Кнігі / С.А. Андраюк. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 318 с.
8. Шамякіна, Т. На лініі перасячэння: літаратурна-крытычныя нататкі / Т. Шамякіна. – Мінск: Маст. літ., 1981. – 143 с.
9. Пташнікаў, І. Тартак / І. Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 462 с.
10. Андраюк, С.А. Чалавек на зямлі: Нарыс творчасці І. Пташнікава / С.А. Андраюк. – Мінск: Маст. літ., 1988. – 254 с.
11. Андраюк, С. Вывяраючы жыццём / С.А. Андраюк. – Мінск: Маст. літ., 1976. – 224 с.
12. Ламека, Л. Сучасная беларуская літаратура: аналіз твораў, матэрыялы да экзамену / Л. Ламека, Н. Ламека. – Мінск: Кніжны дом, 2003. – 384 с.
13. Пташнікаў, І. Пагоня. Аповесць, апавяданні / І. Пташнікаў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2009. – 446 с.
14. Васючэнка, П. Пошукі страчанага дзяцінства: беларускія празаікі «сярэдняга пакалення» аб Вялікай Айчыннай вайне / П. Васючэнка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 80 с.

*Паступіў 28.06.2011*

## AN INDIVIDUAL AS A MOUTHPIECE OF THE MAIN IDEAS AND PRINCIPLES OF THE WAR NARRATIVE BY I. PTASHNIKOV

***T. BAGARADAVA***

*The article dwells on the analysis of works by I. Ptashnikov, dedicated to war, notably, the "Lonva" (1964), "Tartack" (1967), and "Naidorf"(1976) stories. The main principles of the exposition of the war range of problems in the I. Ptashnikov's stories are researched. One of the principal issues of the Belarusian war literature is the study of the individual, which is conditioned by the heightened interest to the problems of human life. The author reflects war and peaceful life in a great number of ways. He traces the characters' emotional experiences in different life situations, given in retrospection. In the works by I. Ptashnikov there is a vital power based on individuality. As a writer skilled in analysis, I. Ptashnikov displays time in a peculiar way. First of all, it can be deduced from his attachment to the present moment. The special feature of the Belarusian war prose is in the interweaving of the life problems of the individual, the moments of the national history, and the modernity.*